# МЕТАД НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Метад навучання беларускай мове —** спосаб сумеснай мэтанакіраванай дзейнасці настаўніка і вучняў, у час якой адбываюцца перадача і адпаведна засваенне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў.

Спосабам рэалізацыі метаду, яго састаўной часткай з’яўляецца прыём. Адны і тыя ж прыёмы могуць выкарыстоўвацца ў розных метадах навучання.

У навуковай літаратуры існуюць розныя класіфікацыі метадаў навучання. Паводле крыніцы атрымання ведаў метады падзяляюцца на славесныя (паведамленне настаўніка, гутарка, лекцыя), наглядныя (назіранне, выкарыстанне наглядных дапаможнікаў і іншыя) і практычныя (практыкаванні, моўны разбор, аналіз моўнай з’явы і іншыя). На аснове асаблівасцей вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў выдзяляюцца метады тлумачальна-ілюстрацыйны, рэпрадуктыўны, часткова-пошукавы, даследны, праблемнага выкладання вучэбнага матэрыялу. З улікам этапаў і мэт навучання метады падзяляюцца на пазнавальныя (паведамленне настаўніка, лекцыя, гутарка, назіранне за моўнымі з’явамі, чытанне вучэбнага матэрыялу падручніка і інш.), практычныя (канспектаванне, састаўленне плана, табліц, схем, вуснае паведамленне, розныя віды практыкаванняў і інш.), кантролю (вуснага, пісьмовага, тэставага і інш.).

Найбольш пашыранымі метадамі навучання з’яўляюцца паведамленне настаўніка, гутарка, назіранне за моўнымі з’явамі, чытанне вучэбнага матэрыялу падручніка, практыкаванні.

**Паведамленне настаўніка** — метад, які звычайна выкарыстоўваецца пры ўвядзенні новага лінгвістычнага матэрыялу. Як правіла, ён прымяняецца тады, калі тэма зусім новая для школьнікаў, вялікая па аб’ёме і дастаткова складаная для разумення. Па часе паведамленне настаўніка можа займаць да 15 хвілін. Паведамленне павінна быць дакладным, лагічным, навукова правільным, даступным для вучняў пэўнага ўзросту. Настаўніку таксама трэба памятаць, што яго маналагічнае маўленне з’яўляецца для школьнікаў ўзорам для пераймання. Звычайна паведамленне настаўніка камбінуецца з назіраннем за моўнай з’явай, элементамі гутаркі і іншыя.

**Лекцыя** праводзіцца ў старшых класах, калі вучні могуць дастаткова працяглы час успрымаць вучэбны матэрыял, самастойна апрацоўваць яго, разумець, усведамляць, прыводзіць у сістэму. Гэты метад навучання дае магчымасць найбольш эканомна выкарыстаць вучэбны час, дазваляе даць большы аб’ём інфармацыі, чым на звычайным уроку. Лекцыя, як правіла, мае такія структурныя часткі: уступную (арганізацыйную), асноўную (перадаецца асноўная лінгвістычная інфармацыя) і заключную (робяцца вывады і абагульненні). Рыхтуючыся да лекцыі, настаўнік павінен

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадумаць, як засяродзіць увагу на яе змесце, як прывучыць школьнікаў слухаць і разумець матэрыял, сачыць за логікай раскрыцця тэмы. Для вырашэння гэтых задач можна запісваць на дошцы тэму лекцыі і яе план, агучваць мэту лекцыі, патрабаваць запісу вучнямі асноўных палажэнняў, ілюстраваць тэарэтычную інфармацыю прыкладамі, выкарыстоўваць элементы гутаркі і іншыя.

**Гутарка** як метад навучання ўяўляе сабой вучэбны дыялог паміж настаўнікам і вучнямі, у час якога настаўнік задае пытанні па тэме, што разглядаецца на ўроку. Пытанні павінны быць правільна сфармуляванымі, канкрэтнымі, пастаўленымі ў дакладана вызначанай паслядоўнасці. У выніку адказаў на пытанні настаўніка школьнікі падыходзяць да разумення новай тэмы, робяць неабходныя вывады і абагульненні, фармулююць правіла. Гутарка звычайна камбінуецца з назіраннем за моўнай з’явай. Гэты метад, як правіла, выкарыстоўваецца тады, калі матэрыял ужо часткова знаёмы вучням, невялікі па аб’ёме і параўнальна лёгкі для засваення.

**Назіранне за моўнымі з’явамі** як метад навучання прадугледжвае арганізацыю планамернага, мэтанакіраванага ўспрымання вучнямі моўных фактаў, з’яў. Назіранне арганізуецца на спецыяльна падабраным настаўнікам лінгвістычным матэрыяле і амаль заўсёды спалучаецца з гутаркай, паведамленнем настаўніка. Яно бывае індуктыўным, калі спачатку на аснове прапанаванага матэрыялу выдзяляюцца прыметы моўнай з’явы, якія затым абагульняюцца, на аснове чаго робіцца вывад, і дэдуктыўным, калі спачатку фармулюецца гіпотэза, якая пасля пацвярджаецца (ці абвяргаецца) сабранымі ў працэсе назірання фактамі.

Сутнасць **чытання вучэбнага матэрыялу падручніка** як метаду навучання заключаецца ў тым, што вучні ў працэсе чытання правіла самастойна ўсведамляюць і засвойваюць неабходныя тэарэтычныя веды. Але, выкарыстоўваючы гэты метад, настаўніку неабходна памятаць пра наступнае: па-першае, самастойна школьнікі могуць усвядоміць і засвоіць параўнальна лёгкі тэарэтычны матэрыял; па-другое, неабходна фарміраваць у вучняў уменне самастойна працаваць з вучэбнай кнігай; па-трэцяе, важна арганізаваць чытанне матэрыялу падручніка так, каб працавалі ўсе вучні. Для вырашэння апошняй задачы можна даць вучням наступныя заданні: скласці план параграфа, падабраць і запісаць уласныя прыклады для ілюстрацыі тэарэтычнага матэрыялу, падрыхтаваць адказы на пытанні, запісаныя на дошцы, і інш.

Метад **практыкаванняў** прадугледжвае шматразовае і разнастайнае прымяненне вучнямі атрыманых ведаў на практыцы з мэтаю фарміравання ўменняў і навыкаў. Рэалізуецца метад ў працэсе выканання заданняў практычнага характару — практыкаванняў, якія на ўроках беларускай мовы займаюць прыкладна 80% вучэбнага часу.

Існуюць розныя класіфікацыі практыкаванняў. З улікам спецыфікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вучэбных дзеянняў, якія ажыццяўляюцца вучнямі, практыкаванні падзяляюцца на аналітычныя (выдзяленне частак цэлага: гукаў, марфем, граматычных формаў, сінтаксічных адзінак і іншыя), сінтэтычныя (аб’яднанне частак у цэлае: складанне словазлучэнняў, канструяванне сказаў і іншыя), аналітыка-сінтэтычныя (выкарыстанне аналізу і сінтэзу адначасова, напрыклад: знайсці ў тэксце назоўнікі пэўнай тэматычнай групы і пабудаваць з імі словазлучэнні ці сказы).

У залежнасці ад этапу засваення моўнага матэрыялу выдзяляюцца практыкаванні прапедэўтычныя (выкарыстоўваюцца з мэтай актуалізацыі апорных ведаў), ілюстрацыйныя (выконваюцца для паказу асаблівасцей утварэння, змянення, функцыянавання моўных з’яў), на фарміраванне ўменняў і навыкаў прымяняць атрыманыя веды на практыцы, паўтаральна-абагульняльныя (садзейнічаюць сістэматызацыі тэарэтычных ведаў і ўдасканаленню ўменняў і навыкаў).

На ўроках беларускай мовы найчасцей выкарыстоўваюцца наступныя віды практыкаванняў: аналіз моўнай з’явы, розныя віды спісвання (ускладненае, гэта значыць з пэўным дадатковым заданнем, і неўскладненае), навучальныя дыктанты, канструяванне і пераканструяванне (словазлучэнняў, сказаў), розныя віды моўнага разбору, творчыя практыкаванні (пераказы, сачыненні) і іншыя.

*У.П. Саўко.*

*Саўко, У. П. Метад навучання беларускай мове / У. П. Саўко // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7 Беларуская мова. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – С. 170–171.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ